УДК 811.161.3'373 = 112.2

Адметнасць ужывання парных эпітэтаў у "Палескай хроніцы" І. Мележа і спосабы іх перакладу на нямецкую мову

Старасціна Ганна Міхайлаўна
старшы выкладчык кафедры замежных моў
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
a.m-star@mail.ru

Анатацыя. У артыкуле аналізуецца пераклад эпітэтаў на нямецкую мову. У аснову даследавання пакладзены фактычны матэрыял, які быў вылучаны з раманаў І. Мележа "Людзі на балоце". "Завеі, снежань" і іх перакладаў на нямецкую мову. У артыкуле разглядаюцца парныя эпітэты арыгінала, вызначаюцца іх адпаведнікі ў нямецкамоўным тэксце. У выніку супастаўляльнага аналізу раманаў І. Мележа "Людзі на балоце", "Завеі, снежань" і іх перакладаў на нямецкую мову вылучаюцца асноўныя прыёмы дасягнення лексіка-стылістычнай эквівалентнасці, якія дапамагаюць пераадоліць лінгвастылістычную рознасістэмнасць беларускай і нямецкай моў.

Ключавыя словы: эпітэт, парныя эпітэты, пераклад, эквівалентнасць, спосабы перакладу.

Abstract. The article analyzes the translation of epithets to the German language. In the basis of research work is an actual material, which was extracted from the novels written by I. Melesh «People of the Marsh», «Blizzards. December» and their translations to the German language. The article deals with the ways of translation of the pair epithets by means of which the lingual heterogeneity of the languages correlated in the course of translation is overcome. The examples of adequate translations are analysed as well as the cases of inadequate translations, an attempt is made to elucidate the reasons of their inadequacy.

Keywords: epithet, pair epithets, translation, equivalence, the ways of translation.

Эпітэт з'яўляецца важным сродкам вобразна-мастацкага адлюстравання і пазнання рэчаіснасці, узбагачэння мастацкага тэксту новымі семантычнымі адценнямі. Эпітэты дапамагаюць дакладна і ўсебакова ахарактарызаваць прадметы і з'явы, падкрэсліваюць найбольш істотныя іх прыметы, узмацняюць выразнасць, вобразнасць мовы твора, надаюць яму мастацкую, паэтычную яркасць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І. Мележ надзвычай уважліва падыходзіў да выбару моўных сродкаў. Вобразнае азначэнне шырока ўжываецца ў яго раманах і з'яўляецца адным з асноўных выразнікаў аўтарскага светабачання. Эпітэты дапамагаюць стварыць яркія мастацкія вобразы, зрабіць мову твораў больш маляўнічай, індывідуальна маркіраванай.

У "Палескай хроніцы" вобразнае азначэнне ўжываецца ва ўсіх кампанентах аўтарскай мовы: пейзажных замалёўках, партрэтных характарыстыках персанажаў, пры паказе іх унутранага стану і г. д. Як справядліва адзначае С.А. Андраюк, "ёсць нейкая асабістая абумоўленасць у тым, што тое, чаго Талстой, напрыклад, дасягае сінтаксісам, моўнымі перыядамі, Мележ робіць пры дапамозе эпітэтаў. І калі паспрабаваць у стылі Мележа, у яго апавядальнай аўтарскай плыні вызначыць найбольш прыкметны, найбольш характэрны элемент яго аналітычнай малюнкавасці, то гэта будзе ў першую чаргу і галоўным чынам эпітэт" [1, с. 291].

Адной з асаблівасцей ідыястылю І. Мележа і характэрнай рысай мовы "Палескай хронікі" З.У Драздова называе "ўжыванне для абазначэння прадмета ці з'явы адразу не аднаго, а некалькіх эпітэтаў" [3, с. 67]. У сувязі з гэтым разгледзім парныя эпітэты, прааналізуем іх перадачу на нямецкую мову.

У большасці выпадкаў у творах І. Мележа да назоўніка далучаюцца два эпітэты (парныя вобразныя азначэнні складаюць 49,5% ад агульнай колькасці). У шматлікіх выпадках адзін эпітэт мае канкрэтна-прадметнае значэнне, другі – пераносна-вобразнае, што дапамагае дасягнуць большай выразнасці, экспрэсіўнасці выказвання.

Парным эпітэтам арыгінала адпавядае розная колькасць мастацкіх азначэнняў у тэксце перакладу. Беларускамоўныя і нямецкамоўныя мастацкія азначэнні выяўляюць наступныя тыпы адносін:

Эпітэты перакладу з'яўляюцца поўнымі эквівалентамі беларускамоўных вобразных азначэнняў: *І днямі, і начамі, не сціхаючы, гайсаў над зямлёй сухі, сіверны вецер, сунуліся* ***нізкія шэрыя*** *хмары* [6, с. 7]. // *Tag und Nacht, ohne Unterlaß, wütete ein schneidender trockener Wind, zogen* ***niedrige graue*** *Wolken dahin* [7, с. 10]. Параўн.: бел. *нізкі* ('які знаходзіцца на невялікай вышыні ад зямлі'), *шэры* ('колер, які атрымаўся ад змяшэння чорнага і белага') – ням. *niedrig* ('нізкі'), *grau* ('шэры').

Каб даць партрэтную характарыстыку персанажаў і адначасова раскрыць іх унутраны свет, І. Мележ ужывае некалькі эпітэтаў перад паяснёным назоўнікам: адзін эпітэт выяўляе аб'ектыўныя ўласцівасці прадметаў або з'яў, другі раскрывае душэўны стан персанажа: *Яна не развяла яго рукі, але і не прыгарнулася вельмі. Як бы не ўзрадавалася. Ён адразу чула заўважыў гэта, стрымаўся.* ***Дужыя, нецярплівыя*** *рукі яго аслабелі* [6, с. 21]. // *Sie wehrte seine Arme nicht ab, aber schmiegte sich auch nicht an ihn. So, als freue sie sich nicht. Er hatte das – sie fühlte es – sofort verstanden und hielt sich zurück. Seine* ***starken,***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ungeduldigen *Hände erschlafften* [7, с. 22]. Параўн.: бел. *дужы* (‘які валодае вялікай фізічнай сілай’), *нецярплівы* (‘які пазбаўлены цярпення пры чаканні чаго-н.’) – ням. *stark* (‘дужы’), *ungeduldig* (‘нецярплівы’). Пры перакладзе захоўваецца метафарычнасць і характарыстычная функцыя беларускамоўных мастацкіх азначэнняў.

Адзін з нямецкамоўных эпітэтаў з’яўляецца поўным эквівалентам беларускамоўнага, другі адрозніваецца паводле канкрэтна-прадметнага і пераносна-вобразнага значэння: *Тут усё было такое непадобнае на яе родны кут: і* ***роўная, ганарлівая*** *печ, і далікатныя, з хітра выразанымі спінкамі, пафарбаваныя канапы, і пільныя багі, і халодная карціна за шклом з зялёнымі гарамі і жоўтымі цэрквамі, і дзіўны пах, цеплаваты, душны, што прабіваўся нават праз пах смажэння* [4, с. 385]. // *Hier war alles ganz anders als bei ihr zu Hause: der* ***glatte, wuchtige*** *Ofen, die angemalten Bänke mit den fein geschnitzten Lehnen, die strengen Heiligenbilder, das kalte Bild hinter Glas, das grüne Berge mit gelben Kirchen darstellte, und der eigentümlich süßliche, schwüle Duft, der sich sogar gegen den Bratengeruch durchsetzte* [5, с. 504]. Параўн.: бел. *роўны* (‘гладкі, прамы’), *ганарлівы* (‘поўны гонару, фанабэрысты, перакананы ў сваёй перамозе’) – ням. *glatt* (‘гладкі, роўны’), *wuchtig* (‘груваздкі, вялікі’). Беларускамоўны эпітэт *ганарлівая* ў адносінах да печы “ўвасабляе затоены страх Ганны перад глушакоўскім домам, яе новым становішчам” [3, с. 56]. Як адзначае З.У Драздова, у гэтым эпітэце – “вызначэнне ўстойлівага ў характары Глушакоў: яны сапраўды лічаць сябе вышэй за “галадранцаў”, бо іх гордасць і сіла – багацце” [3, с. 56]. І. Мележ неаднаразова надзяляе рэчы рысамі характару персанажа, якому яны належаць. Пры перакладзе эпітэт *ганарлівая* замяняецца мастацкім азначэннем з прамым значэннем *wuchtig* (‘груваздкі, вялікі’), якое не выконвае ў нямецкамоўным тэксце характарыстычную функцыю.

Двум эпітэтам арыгінала адпавядаюць у тэксце перакладу тры эпітэты: *Дзе-нідзе каля гумнаў трапляліся людзі, здавалася, усе яны пранізвалі яго* ***пільнымі, здагадлівымі*** *позіркамі* [6, с. 161]. // *Hier und da tauchten Menschen auf Es schien ihm, sie durchbohrten ihn mit* ***aufmerksamen, prüfenden, wissenden*** *Blicken* [7, с. 61]. Параўн.: бел. *пільны* (‘уважлівы’), *здагадлівы* (‘які ўсё разумее’) – ням. *aufmerksam* (‘уважлівы’), *prüfend* (‘выпрабавальны’); *wissend* (‘дасведчаны’). У беларускамоўным тэксце ўжываюцца два эпітэты з ацэначным значэннем, прычым другі ўзмацняе сэнс першага. У нямецкай мове ва ўзмацняльна-пералічальным радзе размешчана тры мастацкія азначэнні, што робіць эмацыянальна-экспрэсіўны эфект выказвання больш моцным, чым у арыгінале, таму такі пераклад нельга лічыць адэкватным.

Перакладаецца толькі адзін эпітэт арыгінала, другі ў тэксце перакладу апускаецца: *Многа дзён сышло, пакуль не ўбачыў, як пачалі выглядваць на пацяплелай, поўнай сонца, люстранасці першыя купіны,* ***вясёлыя, сакавіта-зялёныя*** *грыўкі травіцы на іх* [4, с. 188]. // *Es verging einige Zeit, ehe Mikanor*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

auf dem erwärmten, sonnenüberfluteten Wasserspiegel die ersten Erdhügel mit ***saftig-grünen*** *Grasbüscheln entdeckte* [5, с. 244]. Беларускамоўны метафарычны эпітэт *вясёлыя*, які дапамагае персаніфікаваць пейзаж, на нямецкую мову не перадаецца. Як у прыведзеным прыкладзе, так і ў іншых выпадках, пропуск эпітэтаў у нямецкамоўным тэксце трэба адносіць да недахопаў перакладу.

На нямецкую мову не перадаецца ніводны эпітэт арыгінала: *За ляском зноў* ***ціха, задуменна*** *шумелі* ***бясконцыя*** *рады бяроз, тужліва, загадкава гаманілі правады* [4, с. 261]. // *Danach rauschten <...> wieder Birken am Straßenrand, summten wehmütig und geheimnisvoll die Drähte zwischen den Telegrafenmasten* [5, с. 342–343]. Эпітэты *ціха, задуменна, бясконцыя* ў перакладзе апускаюцца, што прыводзіць да страты пэўнай інфармацыі і зніжэння вобразнасці, экспрэсіўнасці нямецкамоўнага тэксту. Як справядліва адзначае В.М. Буркова, "пропускі вобразных сродкаў заўсёды з'яўляюцца кантэкстава не абумоўленымі" [2, с. 128].

Як паказаў аналіз фактычнага матэрыялу, у нямецкамоўным тэксце не заўсёды захоўваецца тая ж колькасць мастацкіх азначэнняў, што і ў тэксце арыгінала, гэта не дазваляе паўнацэнна перадаць у перакладзе асаблівасці ідыястылю І. Мележа.

Спіс літаратуры

1. **Андраюк, С.А.** Іван Мележ / С.А. Андраюк // Стыль пісьменніка: зб-к артыкулаў : рэд. : акад. В. В. Барысенка, д-р філ. навук П.К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 447 с.
2. **Буркова, О.М.** Пропуски образных средств при переводе поэзии Сергея Есенина на белорусский язык / О.М. Буркова // Язык и межкультурные коммуникации : сб. науч. ст., Минск, 25–28 апреля 2007 года / БГПУ; редкол.: В.Д. Стариченок [и др.]. – Минск, 2007. – С. 127–129.
3. **Драздова, З.У.** Майстэрства слова: Моўна-стылявыя асаблівасці "Палескай хронікі" Івана Мележа / З.У. Драздова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 136 с.
4. **Melesh, I.** Dezember, Sturme / I. Melesh // Sowjetliteratur. – 1981. – № 2. – С.10–99.
5. **Melesh, I.** Menschen im Sumpf / I. Melesh. – Berlin: Verlag Volk und Welt, 1974. – 519 с.
6. **Мележ, І.** Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1983. – Т. 7 : Завеі, снежань: Раман з «Палескай хронікі». – 558 с.
7. **Melesh, I.** Dezember, Sturme / I. Melesh // Sowjetliteratur. – 1981. – № 2. – С.10–99.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова